БЕЛАРУСКІ ШЛЯХ

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі:
Серпухоуская вул. д. № 12

Рэдакцыя адчынена ад 1 до 2 гадз. пасьля поудня.
Адміністрацыя—эрэна ад 10 да 2 гадз. У вечары ад 5 да 7 гадз.

Рэдакцыя пакідае за сабой права папраўляць перасыланые рукапісы і карэспондэнцыі.

Цана асобн. нум. 15 К.

Надпіска: з дастаукай да дому у Мінску на 1 месяц 3 рублі.

Цана абвестак:
за верш пэтыту на 1-й стран. 1 ру[illegible]
на апошняй—50 кап.

Штодзенная грамадзка-палітычная газэта.

№ 21. Менск. Серада 17 красавіка 1918 г. Год I

Менск 17/IV.

Прайшло ужо 14 месяцау, як Беларусь пакладае усе свае сілы, каб стварыць моцны цэнтр, які б пачау адбудову пазбауленаго вякамі дзержаунасьці і пабурэнаго вайной краю.

Усе яе сьвядомыя элемэнты шчыра працавалі над з'іішчэннем гэтай задачы, змагаючыся з высокімі хвалямі рэвалюцыі спадаушымі і на Беларусь.

Цяпер аб'ектыуныя умовы, нізалежна ад волі беларускіх дзеячоу, прыйшлі Беларусі на помач. Мы аказаліся адгароджэнымі абараняючай нямецкай сьцяной ад рэвалюцыі і больш ні чуем гарматняго грукату на нашай зямлі. Прыйшоу спакой, так дарэмна чаканы іішчэ і цяпер на заход і усход ад Беларусі.

Гэты спакой Беларусь павінна выкарыстаць каб пагаіць учыненыя ей гісторыяй раны. Тым болей, што сіла, якая прыйшла бараніць нас, шчырэйшая за нашых нідаунных апякуноу, так сама прызнае прынцып самазначэння народау і ні зьбіраецца нам перашкаджаць. Злучэнне усіх беларускіх элемэнтау у ядыны беларускі фронт, якое намечаецца ужо, дае надзею, што далей пачнецца арганічная праца.

Але што рабіць? Якія бліжэйшыя заданя павінна наставіць перад сабой беларуская дзержауна-творчая мысль?

Да гэтуль, у нэрвовай атмосфэры акаляушых яе падзеяу, Беларусь старалась як найхутчэй праўна развязацца с чужой апекаю, каб потым пачаць гаспадарыць у уласнай хаце. Дзеля гэтаго і чыннасьць беларускіх арганізацыяу мела характэр больш дэкляратыуна праўны. Цяпер гэта павінна зьмяніцца. Акты Рады Рэспублікі тольки сьцвярдзілі post-faktum тое, што ужо зрабіла у гэтым кірунку чужая нам, ні пашкадаваушая і ні думаушая аб нас пры падпісанню Берэсьцейскай умовы Вяліка-росія.

Заданнем Беларусі павінна быць цяпер падвясьці грунт пад абвешчаную нізалежнасьць. Стасоўна да гэтаго павінна зьмяніцца праца Рады і пакіравацца яе усілкі. Трэба пачынаць з адбудовы гаспадаркі і адміністрацыі, каторыя павінны мець нацыянальна-краевы характар. Трэба адрадзіць разбурэную у часе вайны прасьвету, каторая так сама павінна быць нацыянальнай. А поруч з гэтай удзячнай, хаця можа быць і ні надта яскравай працай трэба цярпліва і ні нэрвуючыся старацца, каб сьвет успомніу нашыя слауныя гістарычныя традыцыі і прызнау іх.

Аб сытуацыі на Літве і Беларусі.

«Zeitung der 10 Armee» 7 красавіка піша:

«Мы жывем у часе самаазначэння найменшых народаў. Ніхто ні будзе пярэчыць гэтаму с пагляду на іх культурныя патрэбы. Іншая справа, калі гэтые народы сваімі палітычнымі і ваеннымі дамаганьмі грозяць баспэчнасьці іх магутных суседзяў. У гэткім палажэнні знаходзіцца Нямеччына у адносінах да Польшчы. Ледзьве толькі апошні расейскі салдат дзякуючы нашым пабедам быў выслан с Польшчы, як закраталася «ўсяпольшчына», жадаючы устанаўлення польскіх граніц ад Балтыцкаго да Чорнаго мора, як было перад 1640 годам. Высоўваецца жаданне забраць Вільню, як глаўнае места вялікай Польшчы. Дамагаліся палякі і аннэксіі Літвы і Беларусі, і населеных украінцамі земель Галічыны і Валыні, зусім ні агледаючыся на этнографічныя варункі ў гэтых краёх. Падняты палякамі шум пасьля таго, як мір з Украінай паставіў на чародзі аддзяленне ад Польшчы украінскіх часьцей Холмшчыны, дагэтуль чуваць у нашых вушах. Як трэба ацэніваць польскую саюзьніцкую вернасць, гэта ў канцы канцоў паказалі польскіе легіонэры, каторые хапілі за аружжэ, каб выгнаць свах старых прыяцеляў масквлёў з Беларусі. Ні будзем забываць што палякі замешаны ва ўсе рэвалюцыі. Яны заўсёды кірующа да таго, каб лавіць рыбу у мутнай вадзе і вылавіць нешта дзеля «ўсепольскасьці». Ні расейцы, а палякі—крайныя панславісты, каторых мы павінны сур'ёзна баяцца і ў будучыне. Гэткага суседа трудна цярпець, калі ён лішне узмацуецца. Адгэтуль выплывае для нас патрэба нідапусьціць польскаго пашырэння за цяперашніе межы конгрэсовай Польшчы, с каторай трэба йшчэ выключыць Сувальшчыну, якая па языку і культуры прыналежыць да Літвы. Дзеля тэй жэ прычыны нельга прыстаць на прылучэнне Беларусі да новай польскай дзержавы. Калі мы ўжо ні можам аднасіцца спакойна да варожай нам арміі конгрэсовай Польшчы ў межах да Буга, дык павялічэння гэтай военняй дзержавы да граніц старай Масковіі, значыць, да верхавін Дзьвіны і Днепра, нельга сьцярпець. Ціпнуючы нямецкай карысьці нельга дапусьціць злучэн. Беларусі с Польшчай між Літвой і Украінай, а, наадварот, трэба жадаць, каб Беларусь была нізалежнай дзержавай сама або разам с Літвой між Польшчай і Масковіей. Праўда, мы, як гэта адзначыў канцлер, абязаліся ў мірнай умове ў Бярэсьці ні паддзержываць сэпаратызму тых народаў, якія знаходзяцца за назначэнай намі мяжой нашага ўплыву».

(«Гоман»).

КУТНІК.

Здараецца відзець у нашай староньэ,—
Хоць дзе і чугунка прайшла,
Пры лазьні—у сушні прабіто ваконцэ
З лучынак, с каваллачкам шкла...
Бяз коміну печка, на прыпечку—пуста,
Чалесьнік у шчэрбінах ўвесь,
За заслапкай, можа, і ёсьць там капуста,—
Галодны тэй стравы ні з'есь...
Бо стол тут ні ведае жаднай акрасы,
Як ёсьць—ад каляд да каляд,
І лепшыя рэдка бываюць тут часы—
На чый, асабліва, пагляд...
Скарыначка чорнага хлеба закрыта,
Як шчасьце, грубым палатном,
С пад парэнкі сьвінкам пад лавай карыта
Даўно да гары ляжыць дном...
І прасьніца толькі шнурочкам абвіта
Прытуляна вунь да сьцяны,
І кросны, хоць праўда, стаяць іішчэ зьбіты,
Суседкам паткалі яны!..
На лаве раскідана бульба сырая,
З пацінай са два буракі,
І як на цымбалах дзяцінных іграе,
Шалепчуць кругом прусакі...
На дзыбаўцэ з белай бярозкі калыска—
У ей-жэ нідаўна апошняе блізка
Заснула на векі дзіця...
Адно засталося,—пабегло за маткай
Трапаць у чужых чужы лён...
— А тата дзе будзе?—схаваны лапаткай
У полі крывавым сьпіць ён...
Ні меў ён загончыка поля ніколі,—
Дзе здарыцца кутнікам жыў,—
Праз тое, відаць, ен за Віслай на полі
Галоўку сваю і злажыў!..

Захар Вехаць.

10/IV 1918 г.
Менск

Галасы аб нізалежнасьці Беларусі.

Акт выданы 24 сакавіка Радай Рэспублікі знайшоў сабе одгук у Віленскіх газэтах. «Новый Вѣстникъ» які выходзіць у рускай мове, перадаець сваім чытачам гэты акт у артыкуле «Независимая Бѣлорусь» у № 17 газэты. На сколькі можна рабіць якія нібудзь выснаўкі з стылю артукала, то газэта, як відаць, адносіцца прыхільна да ідэі нізалежнасьці Беларусі і за актам 24 красавіка прызнае значэнне дзежаўна-праўнічае. За Радаю прызнаецца значэнне ядынай установы, якая мае права гаварыць ад імені усёй Беларусі.

Ні тое польскі «Dziennik Wileński». Падаўшы ў № 85 ў перадруку з «Гомана» тэкст акту 24 сакавіка газэта далей гаворыць: І «Было-б надта важным даведацца ці гэты акт апіраецца на якія нібудзь ужо істнуючыя факты, ці толькі выражае замеры людзей складаючых беларускую Раду у Менску? Выказваць свае жычэння пазваляецца усякой группе і нават асобным людзям,—адиак для стварэння нізалежнай дзержавы трэба чагось болі: згоды прынамсі большасьці жыхароў, дзержаўна-творчых сілаў і спосабаў і прызнання з боку другіх дзержаваў. Пакуль німа гэтаго гутарка можа ісьці аб праэктах толькі, ні гаворым наскольки слушных. Мы хацелі-б толькі уйсьці ад усякаго баламучэння агулу праз так званую «лоўлю рыбы перад невадам» і выстаўляне за ужо дакананы факт таго, што істнуе пакуль што толькі як імглістыя праэкты і жычэння».

Так піша «Dziennik Wilenski»... Шчупак—гэтак доўга і старанне мудіушы ваду, цяпер нэрвова б'ець хвастом, бачучы як аблюбаваная ім рыба уцякае с пад самаго яго носу...

Прытомнеюць...

Вялікаросія апамінаецца. Моцна хворая паволі прыходзіць да прытомнасьці. Паказнымі у гэтым сэнсе можна лічыць рэзалюцыі Пензенскаго губэрнскаго з'езду сельскіх і работніцкіх дэлегатаў, які разглядаў ўселякія пытання цякучаго палітычнаго характэру і пытання губэрнскай гаспадаркі. Ні астанаўлячыся на палітычных рэзалюцыях з'езду, якія усё ішчэ сьведчаць аб хваробе, падамо тутака выя рэзалюцыі што даты гаспадаркі. З'езд пастанавіў.

Зацьвярдіць цорму і інструкцыю для тымчасоваго раздзелу зямлі пад ярыну у 1918 г.

Ужыць сгмых рашучых заходау, для астаноукі пасекау лесу, раскрадання лясных матэр'ялау і разгрому складау сьпірытусу.

На усе сілы змагацца з уласніцкімі *нахіламі адзельных весак і валасьцеу.*

Даручыць губэрнскай зямельнай коллегіі зараз жа *прыняць меры для звароту самавольна параскраданаго інвэнтару,* лесу і другога мення а *вінавайцау цягнуць да судоваго атказу.*

Для помачы тым, што ні маюць насення, а так сама для здаволення харчовых ніхваткаў правясьці рэквізыцыю лішак насення, для спаўнення чаго арганізаваць *асобную харчовую міліцыю.* І так: рашучые заходы... змаганне судом... міліцыя.—прымус для таго каб навесьці парадак. Як далёка мае зайсьці гэты процэс німа ведама, але ён ужо пачынаецца.

Агульныя весткі.

— У Рэвелі атрымана з Бэрліну дэпэша.

Эстляндскаму рыцарству і абыватэльству. Праз праводцу рыцарства п. барона Ф. Дэлліисгаузэна у Рэвелі!

Рыцарство і абыватэльство эстляндскае мяне шчыра абрадавало сваёй чалабітнай дэпэшай і выказаным у ёй патрыотычным пачуццём.

Дзякую усім сэрцам Богу, каторы пазволіў мне і у Эстляндзіі вызваліць нямеччыну ад зніштэння распушчанымі бандамі і захаваць ад згубы старадаўнюю культуру. Жычу, каб цянер спакой і безпечэнства вярнуліся у край, каб пад апекаю нямецкай дзержавы нямецкі характэр і нямецкая праца без перашкод разьвіваліся да стопеню высокаго расквіту.

Вільгельм І. Р.

— Чалэбітная дэпэша эстляндскаго рыцарства і абыватэльства была уложэна у такіх выразах.

Яго І. М. Імпэратару Нямецкаму!

Найяснейшы, найміласьцівейшы імпэратар і кароль! Сабраўшыся у ратушы у Рэулі на надзвычайную краёвую Раду рыцарства і абыватэльсцва просіць Вашу Цэсарскую Міласьць ласкава згадзіцца прыняць яго аднамысльнае гарачае падзякаванне, за выратаванне жыхароў Эстляндзіі у мінуты нібезпечэнства і за вызваленне нашай бацькоўшчыны ад чужога панавання.

Рыцарства і абыватэльства трымаюцца перакананння, што Эстляндзія супольна с братнімі правінцыямі Ліфляндзіяй і Курляндзіяй пры найбліжэйшым апірышчы на вялікую нямецкую Айчыну, толькі пад слаўным і пабедным рэгенцтвам Вашай І. М. можэ знайсьці сваю адбудову і шчасьлівую будучыну.

Ніхай Бог благаславіць і захавае Вашу Імпэратарскую Міласьць.

В. І. М. верныя і найподаннейшыя эстляндскія рыцарства і абыватэльства, а ў іх імені праводца рыцарства, Дэллінсгаузэн».

— З Бэрну паведамляюць, што у Квебэке ніспакойна: французская частка жыхароў ні згаджаіцца на набор у войска. Забіто 12 чалавек, шмат зранено.

У Канадзе неспакойства пашыраецца, пераходзючы у нацыянальную барацьбу паміж англічанамі і французамі.

У Монтрэалю сфармавалася партыя, паставіўшая сабе мэтай саусім ні ўжываць французскай мовы.

— Паводлўг газэты «Спектатор», правадыр ірляндскіх нацыяналістау Діллон у сваёй прамові заявіў:

«І гэты дзень я прысягаю тут, што, калі ірляндскаму народу ні будзе дадзена справядлівасьці ні будуць здаволяны нацыянальныя патрэбы Ірляндзіі, я—ад вашаго імяні выступлю проціў Англіі і асаромлю яе на увесь сьвет. Бароначы злучасную Ірляндзію, я зьвярнуся да Амэрыкі і да прэзыдэнта Вільсона і скажу: скажыце Англіі, каб яна, перш чым вясьці гэту вайну быццам за права дробных народаў, лепш вярнулася-б да дому і зрабіла парадак у сваёй хаці».

— Англійскі карэспандэнт Гібо паведамляе з Гаагі: цяпер нашае войско на поўначы стаіць напроці шмат сільнейшаго праціўніка, каторы мае гібель кулямётаў, марцір і іншаго аружжа. Настаў час, каб сказаць народу, што гэта наступленне с паўночы так сама небязпечна, як і тое што пачалося з 21-го сакавіка: што нашае войска шмат слабейшае ад ворага.

Адрады ворага уварваліся у Лавенціле ў дом, паставілі у пакоях кулямёты. стрэлялі праз вокны і кідалі бомбы ў нашэ войска.

— У Партугаліі палажэннэ лічыцца вельмі сур'эзным. Новы прэзыдэнт пад рэспубліканскім сьцягам падгатаўляе рэакцыю. Шмат газэт закрыта. Усе асобы, падазроныя у аб'яўленне рэспублікі, а так сама тых каторых вінавацяць, што яны уцягнулі Партугалію ў вайну —арыштаваны. Рэспубліканскія прапагандныя клюбы зачыняны. У краі—тэррор.

МЕНСКАЕ ЖЫЦЦЕ.

Выязд у Прыбалтыцкі Край на гэтым тыдні скончыцца, дзеля гэтаго камэндантура нямецкая запрапанавала афіцэрам прыбалтыцкаго краю пасьпяшыць зарэгістровацца і заучасу выехаць.

На торговым пляцу - на Троіцкай гарэ у панядзелак 15-га красавіка было пусьцюсенька: ні дроу, ніякіх прадуктау патрабнейшых ніхто ні прывез.

Хлеба за апошнія два дні ужо дастаць труднавата: расхапліваюць усьлед, плацючы па 2 р. за фунт.

Запісь у Гарадзкой Управе сваякоу і жонак, затрыманых вайскова-служачых за апошнія два дні быу так вялік, што прышлося паставіць дзеля парадку міліцыю. Управа усіх іх перапісала на асобных картачках.

Сведзтвы для кабет, чым каторая займаецца, сталі выдаваць у міліцэйскіх вучастках. Праверка дакумэнтау гэтых мае пачацца 17-га красавіка.

У Губэрнскае Прысутство—у судовы аддзел паступіло ужо 100 спрау; апрача таго даунейшых, залежалых і ішчэ ні разабраных спрау асталося каля 600.

Старадауны парадак у Губэрнскім Прысутстві быу такі: зьбірауся судовы аддзел у ауторкі і праз некольні гадзін прапушчау некольні сотак спрау. Трэба спадзевацца, што пры цяперашніх часах ні так легка будзе гэтыя справы глытаць.

Распрадажа цэнтральнаго складу упраулення дарожкых работ пры Х арміі пасля вялікіх клапотау урэшці пачалося. Вырученыя грошы (спадзяюцца каля 200000 р.) пойдуць на выплатку пэнсій і ліквідацыйных рабочым і служачым, каторыя з лютаго м-ца нічога ні атрымоувалі.

На абодвух вакзалах Менска гэтымі днямі пачнецца прадажа праездных білетау.

Цэны 16 красавіка:

1 ф. хлеба . .	2 р. 20 к.
» » солі . . .	1 р. — »
» » рыбы . .	4 р. 50 к.
» » каубасы простай	4 р. 50 к.
1 кв. млека . .	1 р. 50 к.
10 яяк	5 р. 50 к.

Курсы беларусознауства.

Серада 17 красавіка.

Язэп Ліосік. *Гісторыя Вялікаго Князьства Літоускаго.*

Чацьвер 18 красавіка.

Праф. д-р Массоніус. *Гісторыя беларускае мовы.*

Пачатак лекцыі у 6 гадз. веч.

Вакзал Александр. ж. д. у нядзелю 14-га красавіка быу перапоуняны выежджаючымі у Расію. Чуткі, што свабодны праезд у скорасьці будзе забаронены—вызвау гэты перапуд.

Афіцыяльнае павядамленне нямецкаго вярхоунаго камандавання за 16 красавіка 1918 року.

З А Х А Д: Нашыя атакі каля р. Ліс далі нам усьпех. Пасьля рукапашнаго бою узяты былі лейкі. Шпаркай атакай пасьля нідоугаго агню мы узялі Вульвэргэм і пазыцыі непрыяцеля на абаіх бакох вёскі: контр-атакі англічанаў скончыліся ніўдачаю. Нашыя аддзелы адбілі у непрыяцеля ўзвышэння у Ньеваркерке і Бэйэль і узялі іх. Атакі англічанаў на Локон ні удаліся. На абодвых берагах Соммы артылерыйскі агонь ўзмацаваўся толькі каля Люс-Баш (у кірунку Нэрэйль і Мондідье). Пры адпоры злучанай французкай і ангельскай атакі поўночней Люс-Баш мы узялі палонных. У районах каналу Уаз-Энв і на заходнім беразе р. Маас мы зрабілі некольні удачных выступленняў.

У С Х О Д: Наша дэссантнае войско перамогшы вялікія перашкоды прасунулося у Ловізе (на ўсход Гельсінгфорсу) праз Лаппрайск на поўнач і перамогшы у некольніх мейсцах адпор непрыяцеля дайшлі да ж. д. с Таммерфорсу у Выборг на усход Латі.

Першы Гэнэрал-кватэрмэйстар **фон-Людэндорф.**

20.000.000 рублеу, якія былі выданы народнымі камісарамі дэлегацыі служачых Л.-Р. ж. д. і нібыто папера звычайная —былі схованы у вагоне на станцыі Масква, у апошні момэнт здалі у касу упраулення Маскоуска-Курскай ж. д.

Народныя камісары, відаць, перадумалі і ужо ні хочуць аддаваць гэтых грошэй.

Папсавалі наладжаную ужо справу мусіць то быушыя менскія большэвікі, каторыя спаганяюць злосьць сваю на нашых жалезнадарожніках, што перашкодзілі ім у выязьдзе з Менску, ні даушы паравозау.

Большэвіком прышлося уцякаць з Менску на аутамабілях і падводах праз Камароуку па барыскаускаму тракту і само сабой, прышлося адрачыся ад накрадзеннаго дабра, бо ні было дзе забраць.

Трэба ішчэ успомніць, што большэвікі, перад самым прыходам немцау, хацелі высадзіць у паветра абодвы вакзалы, але і гэтаго шальмоуства нашы жалезнодорожнікі ні дапусьцілі. Вось цяпер і помста!

У майстэрні Губ. Земства (Воскрэсенская, 3) прымаюць заказы на плугі, бораны і іншыя гаспадарскія прылады, а так сама і папраука іх. Цэны на усе нізкія. Зьвертацца трэба да заведуючаго майстэрняй тэхніка Н. І. Пальцэва.

Духоуную сэмінарыю у селетнім вучэбным гаду скончыло 16 чалавек, каторыя выказываюць больш нахілу да цывільных выжэйшых школ, чым да духоунаго стану. Відаць, адбіуся на маладых душах пэражыты цяжкі час для нашаго духавенства.

Менск для менчан—гэта паказываюць нам усе выпадкі за апошнія дні. Праз тыдзень—другі у Менску застаюцца, відаць, толькі мейсцовыя жыхары, альбо тыя, што маюць такі, чы іншы, але пэуны звязак с самым местам.

Акружны суд і губэрнскае прысутство мае перад сабой нілегкае заданне выясьніць межы сваей улады. Справа у тым, што нямецкае начальство дае право ім на мейсцы, занятыя Х-ай арміяй т. е. толькі часткамі менскаго, ігуменскаго, барысаускаго і бабруйскаго паветау; дальш займае ужо ні Х-ая, а іншая армія.

Ад Менскай Мешчанскай Управы засталася толькі адна вывяска. Каму і на што яна патрэбна? Зьняць-бы яе хутчэй і захаваць паміж старых забыткау мінуушчыны.

Рэдактар **А. Прушынскі**.

Выдавецтво **Т-во «Заранка»**.

А Б В Е С Т К А.

Менская Гарадзкая Управа робіць ведамым для усіх, што у Сераду 17 красавіка 1918 году а **першай** гадзіне у памешканні будаунічаго адзелу Управы адбудзецца устны торг і сараунаванне у закрытых канвэртах на належачыя да гораду Менска: лясныя матэр'ялы, абозныя часьці, абоза—мэханічныя інструмэнты, бутэлькі.

Ахвотнікі да торгу на памяненыя матэр'ялы могуць аглядаць іх на складзе у мейсцовасьці КУРАСОВШЧЫЗНА Спіс і кондыцїі торгу у Будаунічым Аддзелі Гарадзкой Управы.

Участнікі торгу павінны палажыць 5°/₀ залог.

Член Управы
Інжэнэр *В. Цывінскі.*

За Дзелавода *С. А. Усьціновіч.*

Друкарня Я. А. Грынблята.